М. А. БЯСПАЛАЯ

# БАРЫСАЎШЧЫНА Ў ДАСЛЕДАВАННЯХ Я. П. ТЫШКЕВІЧА І СУЧАСНЫХ ГІСТОРЫКАЎ

Назва артыкула абумовіла яго задачу: раскрыць характэрныя рысы развіцця Барысаўскага павета на працягу амаль стагоддзя – з 1840-х па 1920-я гг. Эмпірычны падмурак даследавання склалі навуковыя працы графа Я. П. Тышкевіча і сучасных гісторыкаў – В. Л. Насевіча і аўтара артыкула. Дарэформенная Барысаўшчына падрабязна разгледжана ў «Апісанні Барысаўскага павета» Я. П. Тышкевіча, паслярэформенная – у навуковым выданні В. Л. Насевіча, прысвечаным родным мясцінам, паслярэвалюцыйная, а дакладней нэпаўская, у манаграфіі М. А. Бяспалай.

Барысаўскі павет, вывучэннем эканамічнага і сацыяльнага стану якога Яўстах Тышкевіч займаўся на працягу 10 год, быў утвораны ў 1793 г. пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай. У нязменным выглядзе праіснаваў да перадачы яго заходняй часткі ў склад Польшчы па ўмовах Рыжскага міру 1921 г.

Навуковая работа графа Я. Тышкевіча «Апісанне Барысаўскага павета» аб'ёмам у 446 старонак была выдадзена ў адной з віленскіх тыпаграфій у 1847 г. Гістарычная яе частка ў 2008 г. была перакладзена на рускую мову і выдадзена барысаўскімі краяведамі, другая частка, прысвечаная культуры земляробства, збіральніцтва, паўсядзённага жыцця, традыцыям і фальклору, існуе на польскай мове. Я. П. Тышкевіч выкарыстоўвае разнастайныя гістарычныя факты, статыстычныя даныя, уласныя назіранні, каб раскрыць мінулае Барысава і некаторых мястэчак павета, напрыклад роднага Лагойска. Значнае месца адводзіцца падзеям вайны 1812 г., якія адбываліся на Барысаўшчыне, эканамічнаму стану павета, заняткам насельніцтва і г. д. Змест яго працы дазваляе сфарміраваць уяўленне аб Барысаўскім павеце першай паловы XIX ст., на жаль, як аб слабаразвітым у эканамічным і культурным плане.

Аб гэтым сведчаць шматлікія факты, прыведзеныя даследчыкам, напрыклад, існаванне ў павеце ў пачатку XIX ст. толькі дзвюх прыхадскіх школ, а ў 1840-х гг. адной, у Барысаве. Яе



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

наведвалі дзеці мяшчан і салдат, да 50 чалавек. Школа ўтрымлівалася на сродкі графа Я. Тышкевіча. Ён падараваў пад школу будынак і садзейнічаў ператварэнню яе ў двухкласную. Дзеля гэтага выдзяляў на працягу 12 год па 25 руб. на ўтрыманне другога настаўніка.

Дастаткова арыгінальнымі з'яўляюцца высновы аўтара аб насельніках павета. Яўстах Піевіч сцвярджаў, што мясцовыя сяляне прыгажосцю не вызначаюцца. Яны здаровыя, але лянівыя, не клапоцяцца аб сваёй уласнасці, а да чужой неабыякавы… Ён заключае, што жыхары маглі бы быт свой значна палепшыць, каб больш завіхаліся каля гаспадарства, а тая лёгкасць, якая дазваляе атрымоўваць драўніну і лясныя дары, не садзейнічае развіццю ў сялян пачуцця неабходнасці ў захаванні чысціні і парадку, зберажэнні сваіх пабудоў. Гэта асабліва робіць край у вачах прыезджых людзей больш бедным, чым ён ёсць у сапраўднасці. Што паўплывала на гэтую досыць рэзкую характарыстыку, ці «класавыя» погляды памешчыка, ці на самай справе сітуацыя так выглядала – застаецца пад пытаннем.

Я. Тышкевіч у складзе павета выдзяляе дзве часткі – лясную і палявую. Ён падрабязна апісвае стан кожнай, і асаблівасці іх развіцця становяцца відавочнымі. У лясную частку ўваходзілі заходнія землі павета. Наяўнасць лясных багаццяў, на думку даследчыка, прадвызначылі ўмовы эканамічнага і сацыякультурнага развіцця гэтага рэгіёна: ад актыўных заняткаў сплавам лесу, развядзення дамашняй жывёлы і выпасу яе па лясах да дрэннага стану вёсак. Аўтар піша аб дамах, якія танулі ў гразі, прагніўшых дахах, агароджы, якая зімою разбіралася на ацапленне, а вясною часткова аднаўлялася. З тэксту адчуваецца негатыўнае стаўленне графа Я. Тышкевіча да факта сумеснага валодання лесам, таму што сяляне без дазволу вырубалі лес, прадавалі драўніну, вугаль, смалу і лічылі гэта законным. Паведамляецца, што жыхары ляснога часткі збожжам не гандлявалі, аб яго запасах не клапаціліся, дадаткова займаюцца бортніцтвам, паляваннем, рыбалоўствам.

У палявой частцы павета, наадварот, насельніцтва атрымлівала даход ад земляробства, займалася перавозкамі па сушы, адыходніцтвам у іншыя месцы на заробкі. Дамы ў іх чыстыя, утрымліваюцца добра, тое ж самае аўтар сцвярджае ў адносі-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нах да сельскагаспадарчых прылад працы. З іх Я. Тышкевіч найперш называе саху, якая ў абедзвюх частках павета называецца па-рознаму, барану, апісвае спосабы сяўбы, жніва і г. д. Вельмі падрабязна даецца апісанне насення, якое ўжываецца ў павеце – пшаніца розных сартоў, жыта, авёс, ячмень, гарох, віка, канопля, лён, буракі і нават кукуруза. Праўда, ён не ўдакладняе ўзровень ураджайнасці, толькі прыводзіць агульную характарыстыку на працягу 7 год: адно жніво вельмі добрае, другое – дрэннае, трэцяе – сярэдняе, два жніва – лепш за сярэдняе, два – горш за сярэдняе. Дамашняя жывёла ў большасці насельніцтва мясцовай пароды, толькі некаторыя багатыя гаспадары маюць галандскую, швейцарскую і інш. пароды буйной рагатай жывёлы, коней вырошчваюць кожны для сябе.

Я. Тышкевіч заканчвае апісанне Барысаўскага павета другой паловай 1840-х гг. У хуткім часе (1861) адбылася аграрная рэформа, якая часцей за ўсё разумеецца як адмена прыгоннага права. Гэтая сацыяльна-прававая працэдура суправаджалася шэрагам аграрна-эканамічных і адміністрацыйных пераўтварэнняў, якія паставілі беларускія губерні на шлях мадэрнізацыі. Як адбываўся гэты працэс у паўднёва-заходняй частцы Барысаўшчыны (па Я. Тышкевічу – у лясной частцы), а больш дакладна на Кораньшчыне, вельмі скрупулёзна расказвае ўраджэнец гэтых мясцін, кандыдат гістарычных навук. В. Насевіч у манаграфіі «Традиционная белорусская деревня в европейской перспективе» (Минск: Тэхналогія, 2004. 350 с.). На падставе аналізу разнастайнага архіўнага і статыстычнага матэрыялу даследчык раскрывае варыянты надзялення сялян зямлёй, паказвае памеры падаткаў, выкупных плацяжоў і г. д. Згодна з рэформай, у Гайна-Слабадской воласці ці на Кораньшчыне ўвесь лес застаўся ў памешчыка, сялянам дазвалялася нарыхтоўваць дровы два дні ў тыдзень толькі ў кастрычніку – лістападзе і толькі з пісьмовага дазволу памешчыка.

У працэсе ажыццяўлення аграрнай рэформы на Кораньшчыне выявілася, што ў 1854 г. ад сялянскіх надзелаў, якія перавышалі 13,3 дзесяцін, была праведзена абрэзка. Па рашэнні Барысаўскай павятовай паверачнай камісіі і са згоды памешчыка ў 1864 г. было вырашана абрэзкі вярнуць. В. Насевіч на дакладных фактах цікава раскрывае супрацьстаянне памешчыка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і сялян пры вызначэнні выкупных плацяжоў і адзначае, што ўласнік маёнтка праіграў цяжбу з сялянамі. Да 1880 г. трое сялян з Кораньшчыны выплацілі выкупны плацеж. Аўтар прыводзіць факты аб надзяленні памешчыкам шасці сялян за былыя заслугі дастаткова значнымі ўчасткамі зямлі і сенакосу, агульная плошча падараванняў склала 85,5 дзесяцін.

Праблемы ў земленадзяленні і землекарыстанні прадаўжалі існаваць да 1917 г., але ў паўсядзённае жыццё насельніцтва ўвайшлі зусім новыя з'явы, выкліканыя рэформамі ў ваеннай і школьнай справе. Іх наступствы садзейнічалі мабільнасці насельніцтва як сацыяльнай, так і тэрытарыяльнай. Увядзенне ўсеагульнай воінскай павіннасці для мужчын з 20-ці год прыводзіла да іх перамяшчэння ў іншыя месцы, а разам з гэтым, а таксама абавязковым навучаннем граматнасці, садзейнічала пашырэнню кругагляду маладых людзей.

Перамены ў эканамічным жыцці выклікалі прыкметны дэмаграфічны рост насельніцтва. Па Мінскай губерні колькасць насельніцтва ад першага перапісу ў 1897 г. да студзеня 1914 г. павялічылася на 38,5 %. Гэтаму ж садзейнічала і з'яўленне арганізаванай медыцынскай службы, аб чым у часы графа Я. Тышкевіча гаварыць не прыходзілася. З 1887 г. Барысаўскі павет дзяліўся на два ўрачэбныя ўчасткі з бальнічкамі на 8–12 ложкаў. У 1903 г. павет быў падзелены на 3 участкі. В. Насевіч прыводзіць даныя па Плешчаніцкаму ўчастку, куды ўваходзілі Гайна-Слабадская, Мільчанская і Плешчаніцкая валасці. Участак абслугоўвалі: адзін урач, адна акушэрка і тры фельчары, участковая бальніца мела 6 ложкаў, за год у ёй лячылася 66 чалавек.

У пашырэнні школьнай сеткі мясцовае насельніцтва было зацікаўлена. За валасныя сродкі і з дапамогай мясцовай памешчыцы К. С. Смаляк была адчынена школа ў в. Слабада, на стварэнне пры школе майстэрні выдзяліў сродкі сваяк памешчыцы і ў дадатак абавязаўся ахвяраваць па 15 руб. на ўтрыманне школы на працягу 10 год. На аплату настаўнікам і майстрам валасны сход пастанавіў збіраць па 10 кап. з рэвізскай душы мужчынскага полу, у выніку атрымоўвалася 210 руб. 70 кап.

Не абмінулі Барысаўшчыну і міграцыйныя працэсы, якія актыўна пачалі развівацца пасля рэформы 1861 г. Спачатку

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэта было адыходніцтва ў іншыя губерні на заробкі. Па высновах В. Насевіча, у канцы XIX ст. колькасць адыходнікаў у Барысаўскім павеце была нізкай. Тое ж самае ён сцвярджае і наконт перасялення мясцовых сялян у Барысаў і ў іншыя рэгіёны імперыі, а таксама за мяжу.

Развіццё чалавецтва пацвярджае старажытную выснову, што гісторыя не ведае скачкоў. Аднак пераўтварэнні, якія пачаліся ў 1917 г. хаця і былі выкліканы аб'ектыўнымі прычынамі, аналагаў у сусветнай гісторыі не мелі. Па звестках В. Насевіча, у чэрвені 1917 г. Барысаўскі зямельны камітэт прыняў пастанову аб раздзеле часткі прыватных сенакосаў, што выклікала іх масавы захоп. Часовы ўрад быў вымушаны адмяніць гэтае рашэнне, у адказ Барысаўскі з'езд сялянскіх дэпутатаў выказаў недавер павятоваму камісару Часовага ўрада. Восенню 1917 г. на Барысаўшчыне было разгромлена 17 памешчыцкіх сядзіб.

Пасля ўстанаўлення савецкай улады ў кастрычніку 1917 г. і да яе канчатковага ўмацавання ў ліпені 1920 г. на Барысаўшчыне адбываліся самыя разнастайныя падзеі: акупацыя павета спачатку германскімі, затым польскімі войскамі, у прамежках – аднаўлялася савецкая ўлада.

З пачатку 1920-х гг. пачынаюцца пераўтварэнні, якія дыктаваліся праграмай бальшавіцкай партыі. Аб кардынальных пераменах у жыцці тагачаснага грамадства расказваецца ў манаграфіі М. А. Бяспалай «Эканамічнае і сацыякультурнае развіццё беларускай вёскі ў гады нэпа (1921–1927)» (Мінск: БДУКМ, 2009. 325 с.). Паказальным фактам эканамічнага заняпаду Барысаўскага павета, дарэчы самага вялікага ў тагачаснай БССР – 831 вёска, стаў недасеў больш чым на адну трэць азімага і яравога кліна. З вялікімі цяжкасцямі Барысаўшчына прыступіла да выканання харчпадатку згодна разнарадцы ў межах новай эканамічнай палітыкі. Напрыклад, да 20 жніўня 1921 г. ні па адной з 26-ці валасцей поўнасцю не былі складзены спісы падаткаплацельшчыкаў, а тыя, што падрыхтавалі, правяраючы назваў «хламам». Было відавочна, што сяляне адносіліся да падатку, як і да харчразвёрсткі, вельмі дрэнна. У адказ прымаліся самыя жорсткія меры. Напрыклад, у Грэбенскай воласці было арыштавана трое сялян, а жыхара в. Студзенка, які агітаваў супраць падаткаў, меркавалася ізаляваць на доўгі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэрмін. Пры зборы падатку выкарыстоўвалі ўзброеную сілу, але на кастрычнік 1921 г. Барысаўшчына выканала спушчаны зверху план толькі на 35 %, у Мсціжскай воласці сабралі толькі 19 % ад плана. Не дапамагала «цяжкая артылерыя» ў выглядзе выязных сесій Рэўтрыбунала, харчдружыннікаў. На 10 лістапада выканалі каля 67 % харчпадатку. У адказ у павеце былі закрыты мясцовыя рынкі.

Прадстаўнікі новай улады аказаліся не падрыхтаванымі да такой сітуацыі. Адзін з іх пісаў начальніку ў Мінск аб ходзе выканання харчпадатку ў Барысаўскім павеце наступнае: «…Афіцыйна мы ўсе пішам, настрой у большасці сялян добры, аднак фактычна гэта хлусня: настрой сялян кепскі ды і лепшага настрою быць не можа. Селянін, як кожны чалавек, незадаволены, калі ў яго што-небудзь бяруць, але калі ў яго бяруць хлеб, да таго ж яшчэ вялікі падатак, то, само сабой, ён не можа заставацца задаволеным. Да гэтага дадай яшчэ: замест 0,5 пуда насення – пуд, яму гавораць, што павінен плаціць 9 фунтаў мяса, а прымаюць па 22 з паловаю толькі жывой вагі. Але самае галоўнае, што выклікала моцнае незадавальненне, гэта тое, што з каровы, з якой ён заплаціў падатак маслам, з яго яшчэ патрабуюць мяса, з авечкі, з якой ён ужо адзін раз аддаў воўну, патрабуюць мяса і жывую авечку з воўнаю. Яны здзіўляюцца. Што мне ім адказваць? Адказвай ты.

А тут яшчэ гэты падатак на дамашнюю птушку і абавязкова з ворыўнай плошчы... Мы хочам гэтым падштурхнуць сялян да развядзення дамашняй птушкі, хаця я асабіста думаю, што лепшым стымулам было б даць сяляніну птушку, а не забіраць у яго. Але, як бы там ні было, сяляне не хочуць гэтага ведаць і з іроніяй пытаюцца: “А што, мая зямля яшчэ яйкі нясе?” А цяпер будуць пытацца: “А што, мая зямля птушку родзіць?” І калі-нікалі бывае нават смешна... Калі ты хоць трохі знаёмы з настроем сённяшняй вёскі, то ты ведаеш, што сяляне цяпер толькі і мітынгуюць аб тым, як бы гэта з іх знялі зусім той або іншы падатак ці хаця б трохі паменшылі, а калі станеш гаварыць пра тое, што трэба здаваць падатак, то з усіх бакоў пачуеш: ведаем, ведаем, ужо чулі. Хопіць!».

Адначасова са змаганнем сялян за зямлю, супраць харчпадатку, стварэння ў былых маёнтках саўгасаў і іншых мерапры-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

емстваў савецкай улады на Барысаўшчыне шырокае распаўсюджанне знайшла ідэя беларусізацыі. Яна мела глыбокія карані, таму што яшчэ ў 1905 г. вучні гарадскога вучылішча арганізавалі беларускі гурток. Яго ўдзельнікі збіралі народныя творы, знаёміліся з роднай мовай. Пасля 1917 г. праца ў адраджэнскім кірунку прадаўжаецца: арганізуюцца зборы на карысць беларускага фонду, ставяцца беларускія спектаклі і г. д.

Актывізацыя беларускага руху ў Барысаўскім павеце адбылася пасля стабілізацыі палітычнай сітуацыі. Настаўнікі з усіх валасцей – слухачы двухмесячных педагагічных курсаў, на сходзе ў чэрвені 1921 г. стварылі беларускі гурток. Ініцыятарам выступіў Я. Таразевіч з крайскага гуртка «Вянок». Яны ставілі перад сабою мэту пашырэння беларускай культуры шляхам пастаноўкі спектакляў, чытання лекцый, выступленняў хору і арганізацыі літаратурных вечароў.

Справа беларускага адраджэння атрымала моцны імпульс пасля прыезду ў Барысаў А. Іванова-Казельскага. Ён меў дачыненне да тэатральнай творчасці, якою займаўся паўтара дзясятка гадоў як акцёр, рэжысёр і аўтар адначасова. Таму і быў прызначаны інструктарам-рэжысёрам рускай і беларускай труп і адначасова старшынёй беларускай секцыі (потым пададдзела) у аддзеле асветы. Ён абраў псеўданім Сымон Музыка.

На другім агульным сходзе беларускага гуртка пры настаўніцкіх курсах Сымон Музыка (так ён падпісваўся нават на афіцыйных дакументах) зрабіў даклад аб агульным стане беларускай культуры і прапанаваў стварыць пастаянна дзеючы гурток у Барысаве, прыцягнуўшы да працы ўсіх мясцовых беларусаў. Ён выступаў некалькі разоў і вельмі пранікнёна гаварыў аб «неабходнасці падцягнуцца, каб не было закідаў, што беларусы нічога не ўмелі, не ўмеюць і не зробяць у будучым». Ён даводзіў прысутным аб паспешлівых рашэннях, аб немагчымасці дапамогі з боку дзяржаўных устаноў. Пад уплывам выступлення Сымона Музыкі сход прыняў рашэнне рэарганізавацца ў «Беларускі культурна-асветніцкі гурток у складзе драматычнай, харавой, літаратурнай і выдавецкай секцый».

У хуткім часе гурток стаў называцца «Беларуская навукова-культурная грамада». Яна была зарэгістравана 10 студзеня 1922 г., яе статут зацвердзіў наркам асветы У. М. Ігнатоўскі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Новая арганізацыя ставіла вельмі шырокія мэты: вывучэнне асаблівасцей і старажытнасцей Бацькаўшчыны, арганізацыю артыстычных выстаў на базе беларускіх драматычных, музычных і літаратурных твораў, адкрыццё беларускага музея, выстаў культуры краю, правядзенне курсаў, чытанне лекцый па краязнаўстве. Разуменне Грамадою неабходнасці захавання і развіцця народнай спадчыны, на наш погляд, не выклікае сумнення, але праграма аднаўлення ўсіх старых культурна-навуковых помнікаў, якія захаваліся ў народзе і ходзяць сярод яго ў легендах, казках, спевах, адразу аказалася нерэальнай. Гэтак жа варта ацаніць і заклікі да ўсіх культурнікаў запісваць арыгінальныя дыялекты беларускай мовы, народныя мелодыі, легенды, казкі, вершы, паданні, апавяданні і збіраць мастацкія, ткацкія, ганчарныя вырабы.

Пасля заканчэння летніх курсаў настаўнікі раз'ехаліся па сваіх школах, і ў васьмі валасцях павета былі арганізаваны беларускія культурна-асветніцкія гурткі, якія працавалі незалежна ад валасных палітасветаў. Галоўным відам іх дзейнасці стала пастаноўка спектакляў. Як пісалася ў справаздачы аднаго з гурткоў, гэта давала магчымасць гледачам зразумець, што на простай мужыцкай мове можна не толькі чытаць альбо пісаць, але нават адбіваць малюнкі жыцця з усёй прыгажосцю, пекнатой, зразумеласцю.

З мясцовых гурткоў самы цікавы і дзеяздольны склаўся яшчэ ў красавіку 1920 г. у мястэчку Крайск. Дванаццаць настаўнікаў мясцовай школы, прымаючы пад увагу пэўную адсутнасць, бадай, якое асветніцкае працы ў той час, калі сялянства вёскі, асабліва моладзь, адчувае надзвычайна пякучую патрэбу ў асвеце і павышэнні агульнакультурнага ўзроўню, ствараюць гурток з прыгожай назвай «Вянок». За першы год існавання сябры гуртка паставілі шэсць спектакляў, галоўным чынам фальклорнага кшталту. Арганізатарам і рэжысёрам быў В. Таразевіч, хор узначальваў І. Чачык, струнны аркестр – Я. Таразевіч, артыстам і лектарам па беларусазнаўстве быў Я. Трубач. Гурток існаваў, як сведчаць дакументы, да 1923 г., і яго дзейнасць, безумоўна, яркі прыгожы прыклад таго, як многа можна было зрабіць невялікімі, але актыўнымі сіламі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Статут вянкоўцаў ставіў сваёй задачай пашырэнне беларускай культуры і роднай мовы, прадугледжваў «адкрыццё беларускіх хат, кнігарняў, пастаноўку спектакляў, выступленні перад рознымі таварыствамі, каб бараніць беларускую справу і асвету, знаёмства насельніцтва з гісторыяй Бацькаўшчыны, роднай літаратурай, збіранне беларускіх народных твораў, запіс мелодый і беларускіх спеваў, этнаграфічнага і гістарычнага матэрыялу». Паказальным з'яўляецца наступнае патрабаванне: «Сябрам гуртка размаўляць паміж сабою і ўсюды на беларускай мове».

Гурток крайскіх настаўнікаў адыграў важную ролю ў справе надання беларускім народным традыцыям афіцыйнага прызнання. Прыкладам можа быць святкаванне Купалля. Двойчы, у 1921 і 1922 гг., вяскоўцы ладзілі гэтае свята па дакладна распрацаванай праграме. На адкрытай сцэне ставіўся спектакль «На вёсцы» Ф. Аляхновіча, потым хор выконваў беларускія песні, а струнны аркестр іграў беларускія мелодыі. Апоўначы пачыналіся карагоды і скокі праз вогнішча... Звернем увагу, што гэта адзінае ўпамінанне ў дакументах, якімі карыстаўся аўтар, аб прызнанні народнага свята.

4 верасня 1921 г. былы барысаўскі курсант Я. Бабкоўскі, настаўнік Гасцілавіцкай школы на Лагойшчыне, арганізаваў гурток пад назвай «Працаўнік». Большасць яго сяброў складалі сялянская моладзь і вучні мясцовых школ. Памяшканне гуртка мела назву «Беларуская хата». Тут праводзіліся лекцыі па гісторыі геаграфіі Беларусі, два разы ў тыдзень непісьменныя сябры гуртка вучыліся чытаць і пісаць, тут знаходзілася бібліятэка. «Працаўнік» распачаў сваю дзейнасць 18 верасня 1921 г., паставіўшы спектаклі «Міхалка» і «Гутарка рабочага і селяніна аб харчовым падатку». Мясцовыя ўлады спачатку даволі скептычна аднесліся да гуртка, але пасля першага спектакля адбыліся некаторыя станоўчыя змены. Праўда, патрэбнай матэрыяльнай дапамогі гурток не атрымаў, бо выканкам лічыў, што «зараз нэп, і ўсё трэба купляць за свае грошы». За восень 1921 г. гурткоўцы паставілі 5 спектакляў, зімою абмежаваліся арганізацыяй літаратурных вечарын, выступленнямі хору ў вёсках Лагойшчыны і лекцыямі па гісторыі геаграфіі Белару-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сі. Кіраўнік гуртка займаўся запісам абрадавых і калядных песень.

Беларускія культурна-асветніцкія гурткі дзейнічалі ў вёсках Корань, Малыя Ухалоды, Кішчына Слабада, Гарадзішча, Слабада, Забяшэвічы. Сябрамі іх былі ў асноўным прадстаўнікі сялянскай моладзі, арганізатарамі-кіраўнікамі – мясцовыя настаўнікі, былыя барысаўскія курсанты. На іх лёг увесь цяжар арганізацыйнай і творчай працы, аб чым сведчыць ліст з Гайна-Слабадской воласці на імя Сымона Музыкі: «Сябра Сымоне! Мы ўжо пачалі збольшага сваю гуртковую працу. У суботу, 22 красавіка 1922 г., у Корані адбыліся першыя гуртковыя спектаклі: “Чорт і баба” і “Міхалка”. Пасля вучні дэкламавалі вершы Я. Купалы і Я. Коласа. Кепска толькі з тым, што кругом і ва ўсім недахваты, перш за ўсё няма культурных сіл, ледзь не аднаму мне даводзіцца збіраць і зносіць на плячах дошкі для сцэны, ды і пазычыць гэтых дошчак не так лёгка – ніхто не хоча даваць. Кепска, што ўся праца ляжыць на мне не як на старшыні арганізацыі, а як на нейкім дыктатары, бо няма з кім раіцца – ніхто не папсуе і не наладзіць справы. Язэп Гладкі, 25 красавіка 1922 г.».

Абыякавае стаўленне кіруючых інстанцый да беларускіх аб’яднанняў вяло да заняпаду іх дзейнасці. Без матэрыяльнай і маральнай падтрымкі працаваць аказалася немагчыма. У першай палове 1923 г. спыніла сваё існаванне «Беларуская навукова-культурная грамада», паціху замірала дзейнасць валасных беларускіх гурткоў. У дакументах наступных гадоў не сустракаецца ніякіх звестак аб іх. Аднак важна, што на самым пачатку мірнага жыцця менавіта знізу робіцца спроба беларускага адраджэння, абуджэння нацыянальнай самасвядомасці, інтарэсу і павагі да сваіх мінуўшчыны, мовы і культуры. Ля вытокаў гэтай патрыятычнай з’явы стаяла вясковае настаўніцтва, якое тым самым выконвала галоўнейшую і высакароднейшую задачу народнага асветніцтва.

Такім чынам, на працягу амаль стагоддзя Барысаўшчына разам з астатняй Беларуссю пакутліва праходзіла шлях ад пераадолення перажыткаў, нястач і бед традыцыйнага грамадства і натуральнай гаспадаркі, аб чым дастаткова пераканаўча сказана ў кнізе Я. П. Тышкевіча, хуткіх перамен у сацыякуль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

турным развіцці пад уплывам рэформ другой паловы XIX – пачатку XX ст., якія актывізавалі мадэрнізацыйныя працэсы ва ўсіх сферах, аб чым расказана В. Я. Насевічам на прыкладзе роднай вёскі і воласці, і да кардынальнай перамены кірунку ўсіх бакоў эканамічнага і сацыякультурнага развіцця пасля рэвалюцыйных узрушэнняў 1917 г.

А. І. СМОЛІК

## ЯЎСТАФІЙ ТЫШКЕВІЧ У КААРДЫНАТАХ СВАЙГО ЧАСУ

Навуковая думка Беларусі ў XIX ст. складвалася пад уплывам разнастайных эканамічных, сацыяльна-палітычных, культурных і ідэйных фактараў. Навуковыя адкрыцці ў галіне фізікі, хіміі, біялогіі, астраноміі, геалогіі, медыцыны адбываліся адно за адным. Прыродазнаўчы прагрэс паўплываў і на гуманітарныя навукі, шэраг з якіх пераходзяць на пазіцыі біялагічнага рэдукцыянізму. Гэта закранула асобныя кірункі этналогіі, псіхалогіі, сацыялогіі і, безумоўна, узнікшай у канцы стагоддзя навукі аб культуры (культуралогіі, культурнай антрапалогіі). Станоўчы ўплыў на фарміраванне свядомасці інтэлігенцыі аказваў і вызваленчы рух, які разгарнуўся ў 1820–1840-я гг. У гарадах нашай краіны было створана некалькі тайных таварыстваў, якія ставілі сваёй мэтай падрыхтоўку ўзброенага паўстання супраць расійскага царызму, выступалі з патрабаваннем сацыяльных і палітычных перамен.

Рост нацыянальнай свядомасці народа, актывізацыя барацьбы за вызваленне і выхад на арэну гістарычнай творчасці садзейнічаў развіццю беларускай нацыянальнай культуры. У літаратуру, выяўленчае мастацтва, навуку прыйшла бліскучая плеяда творцаў, якія стаялі на пазіцыях рамантызму, у якім спалучаліся рысы дваранскага асветніцтва, дыдактызму і сентыменталізму. Прадстаўнікі беларускага рамантызму арыентаваліся на духоўныя каштоўнасці народа. Вялікую ролю ў развіцці грамадскай думкі адыгралі вучоныя і выкладчыкі Віленскага ўніверсітэта, Горы-Горацкага земляробчага інстытута.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ